Рыхтуемся да вуснага выказвання

Сямёнава Алена Уладзіміраўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
ДУА “Сярэдняя школа №7 г.Баранавічы”

СХЕМА ВУСНАГА ВЫКАЗВАННЯ

_____

1.	
2.	
3.	

Прыклады:

1) А што, урэшце, галоўнае на зямлі і што кіруе светам? (Я. Сіпакоў)

Не трэба жыць, як набяжыць.
Так жыць на свеце трэба,
Каб да апошніх дзён любіць
Людзей, зямлю і неба…
А. Грачанікаў

Шугае стагоддзе за стагоддзем, пакаленне змяняе пакаленне, а вечныя пытанні будзяць душы, не даюць спакою сэрцу. Можа, і мне, пясчынцы на планеце Зямля, пашукаць адказу на пытанне: "А што галоўнае на зямлі і што кіруе светам?" **Дзе ж знайсці адказ на яго?** Можа, у слоўніку афарызмаў? Ці звярнуцца да прачытаных твораў? А можа, спытаць у бацькоў?

Поль Верлен піша, што "музыка перш за ўсё", **Янка Брыль** упэўнены, што "вышэй за ўсё і перш за ўсё чалавечнасць", для **Яўгеніі Янішчыц** "пачынаецца ўсё з любві", **Дастаеўскі** сцвярджае, што "прыгажосць выратуе свет", **Васіль Быкаў** – "моц чалавечага духу", **Кузьма Чорны** прапануе выбраць дарогу, "якая не вядзе ў прорву". **З чыімі меркаваннямі сугучныя мае думкі?**

Мабыць, падлеткавы ўзрост паўплываў на маё рашэнне, а можа, проста жаночыя думкі супадаюць, але я згаджаюся з Яўгеніяй Янішчыц: на свеце, на самай справе, усё пачынаецца з любві, і менавіта любоў кіруе светам. Аднак колькі адценняў схавана ў гэтым слове! Можна гаварыць пра любоў да маці, а можна – да апельсінаў. **Так якая ж любоў кіруе светам?**

На мой погляд, можна выдзеліць тры асноўныя "любоўныя" адгалінаванні: любоў да Радзімы, любоў да людзей і любоў да блізкага чалавека. Будзем рухацца паступова. Якую ролю ў жыцці чалавека адыгрывае Радзіма і чаму любоў да Бацькаўшчыны з'яўляецца адной з галоўных рэчаў на зямлі, паспрабую высветліць у першую чаргу.

Для гэтага звернемся да класікаў беларускай літаратуры. Мне здаецца, найбольш шчырыя, душэўныя адносіны да Радзімы ў героя рамана **Кузьмы Чорнага** *"Пошукі будучыні"* – Нявады. Без Волечкі і без шыпшыны няма для яго Бацькаўшчыны. Ён упэўнены, што *"лепш грызці зямлю ў родным кутку, чым каб цябе ліхім ветрам кідала па чужым свеце"*. **Максім Гарэцкі** ў апавяданні *"Роднае карэнне"* таксама адзначае, што *"сувязь чалавека з роднай зямлёй, са сваім народам і ёсць тая сіла,*

якая дапаможа выбраць правільны шлях у жыцці…не страціць сябе, быць карысным для іншых”. Такім чынам, Радзіма – гэта пачатак усіх жыццёвых дарог, нашы карані, а без карэння не могуць існаваць не толькі дрэвы, але і людзі.

Рушым далей. Вечнасць жыцця забяспечваецца выкананнем вечных законаў, сярод якіх галоўны – чалавечнасць. Любоў да людзей, неабыякавасць да іх праблем і няшчасцяў – вось ключ да няспыннасці жыцця. Па доказы варта звярнуцца да паэзіі, якая цалкам будуецца на філасофскіх разважаннях. Яскравае пацвярджэнне знаходжу ў **Пімена Панчанкі**, чыя творчасць прасякнута верай у моц чалавечнасці і вострую неабходнасць душэўнай спагады.

Толькі б захаваць
Усё найлепшае,
Толькі б пахаваць
Усё найгоршае.
Бо без чалавечнасці
Не будзе і вечнасці.
(“За вогненнымі вякамі”)

Сапраўды, адзінай меркай вартасці чалавека з’яўляецца чалавечнасць. Пра гэта ведалі яшчэ нашы продкі, таму занатавалі парады ў прыказках: “добраму ўсюды добра”, “добраму добрая памяць”, “рабі дабро, яно не надакучыць”. У рэшце рэшт, можна смела сказаць, што кіруе светам чалавечнасць, уменне быць уважлівым да людзей, якія вакол цябе, бо *“людзі ласкай лечацца людской”* (*Пімен Панчанка*).

Любоў да блізкага чалавека – наступны крок у нашым аналізе. Хто яны – блізкія людзі? Бясспрэчна, гэта наша сям’я, а таксама людзі, пачуцці да якіх у беларускай мове носяць паэтычную назву *каханне*. Закаханыя пачынаюць пісаць вершы, музыку, здзяйсняюць подзвігі, а некаторыя, як герой п’есы **Аляксея Дударава** *“Чорная панна Нясвіжа”* Жыгімонт, гатовыя нават адмовіцца ад улады: *“Мне Польшча без Барба́ры не патрэбна! Хай ведае і канцлер, і сенат, усе, хто пасылае ёй праклёны, я лепей адракуся ад кароны, чым ад яе…”* І, безумоўна, нельга не сказаць некалькі слоў пра тую жанчыну, якая падарыла нам найвялікшую каштоўнасць – жыццё. Гэта, канечне, маці. Любоў і павага да маці – самы кароткі шлях да духоўнага ачышчэння.

Такім чынам, можна смела сказаць, што галоўнае на зямлі – гэта любоў. Любоў да Радзімы, чалавецтва, блізкіх людзей – вось што кіруе светам. Шкада, што сёння нашу планету пачынае паглынаць любоў да небяспечных рэчаў: грошай, маёмасці, славы, улады. Таму варта запомніць словы **Анатоля Грачанікава** і “не жыць так, як набяжыць”, не захапляцца рэчамі-аднадзёнкамі, а заўсёды знаходзіць месца ў душы, недзе пад сэрцам, для светлага пачуцця – любві.

2) ВОСЕНЬ

У Іспаніі заўсёды лета. У
Расіі – зіма.
А на Беларусі – восень.
Позняя восень...

Уладзімір Сцяпан (ul-sciapan.livejournal.com)

1. Назавіце фанетычную асаблівасць беларускай мовы, адлюстраваную ў слове *восень*. Растлумачце прычыны яе ўзнікнення.

2. Утварыце ад слова *восень* усе магчымыя прыметнікі.

3. У "Марфемным слоўніку беларускай мовы" слова *лістапад* запісана двойчы:

ліст-а-пад-ø-□ (.....)
лістапад-□ (.....)

Якая інфармацыя змешчана ў дужках пасля слоў?

4. Назвы якіх асенніх месяцаў прапушчаны ў народных выслоўях:

- _____ *ні калёс, ні палоз не любіць;*
- *Як настаў* _____*, дык туман кожны дзень;*
- _____ *на рабой кабыле ездзіць: то снег, то слата.*
- *У* _____ *кладзі капусту ў кадзі;*
- *Як настане* _____ *– гаспадарам поўна гумно і кішэнь;*
- _____ *зямлю балоціць, а лес дык залоціць;*
- *У* _____ *гола ў садзе.*

5. Дайце тлумачэнне словам, вытворным ад слова *восень*:

- Заўжды ў асенні час, нібыта князь даніну, збіраў пастух у нас калісьці асяніну (А. Зарыцкі);
- На Асяніны беларусы прывыклі ўзгадваць добрым словам сваіх продкаў;
- Колькі ў яе цяпер тае гаспадаркі: асянчук-кабанчык ды дзве курыцы з пеўнем (А. Васілевіч).

Перакладзіце апошні сказ на рускую мову.

6. Зрабіце марфалагічны разбор слова *восенню* ў вершаваных радках **Уладзіміра Караткевіча**:

1) Што ж, злятае ліст глыбокай ***восенню,*** *Каб дарогу даць лістам другім.*	*2) Атачон з усіх чатырох бакоў Золкай* ***восенню*** *мой лясны будан.*

7. Складзіце з фрагментаў верш **Максіма Танка** "У беларускую восень"

У беларускую восень	
Нат і верабей _____*,*	*звіняць на вяселлях*
Лес _____*,*	*набракаюць*
Пуні _____*,*	*гараць ад лістоты*
Мёдам вуллі _____*,*	*на грыбы не скупіцца*
Сцежкі _____*,*	*багацее*

Скрыпкі _____,	*дабрэюць*
І маладзіцы _____ –	*хмялеюць ад сена*
У беларускую восень.	

Дапішыце самі некалькі радкоў гэтага верша.

8. **М. Танк** “У лістапад”

Бацька прынёс	*Што гэта верасень*
Вёдры, поўныя восені,	*Са сваімі сябрамі*
*І кажа: – **Слата**, туман.*	*Неганісабакузхаты,*
	Дажджахлюпам і Гразяшлёпам
***Сырадой** раніцы*	***Зацеплілі** нашу **лазню***
Маці перацадзіла	*І хвошчуцца венікамі **прысад**,*
*І кажа: – **Золь. Імжа**.*	*Толькі пара клубіцца,*
	Толькі пырскі лятуць
А мне здаецца,	*І лістота ўсцілае зямлю.*

Перакладзіце на рускую мову ***выдзеленыя*** словы.

Зрабіце словаўтваральны аналіз усіх аўтарскіх наватвораў з гэтага верша.

Ілюстрацыяй якіх паняццяў мог бы стаць гэты верш у “Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў”?

9. Як бы выглядаў прагноз надвор’я на дзень, аб якім расказвае **М. Танк** у вершы “У лістапад”?

10. Спішыце верш **Эдуарда Акуліна** “Восень”, устаўляючы літары, знакі прыпынку і раскрываючы дужкі.

Апалых лісц...ў пах	*што ...моўкнуў птушак спеў*
Туманныя св...танкі	*што лета ў копы склалі*
Гу...нявы дождж у дах	*Пажары ў кронах дрэў*
бубніць (без/с)перастанку	*пажарнікі праспалі*

Уявіце, што вам даручылі зняць відэазамалёўку на верш Э. Акуліна. Калі ласка, складзіце яе сцэнарый.

3) Заліковая работа па комплексе “Восень”_____

Пытанні	Адказы
1. Закончыце прымету: *Лістапад на рабой кабыле ездзіць:*.....	
2. Памета, якую ў слоўніках мае слова *асяніна.*	
3. Самы вядомы беларускі паэт-верлібрыст.	
4. Перакладзіце на беларускую мову: *Ветер – 5–6 метров в секунду.*	
5. У перакладзе якога слова на беларускую мову ўзнікне прыстаўны гук: *слякоть, сырость, изморось.*	
6. Ад слоў 1) *ліст-а-пад-ø-□* і 2) *лістапад-□* утварыце прыметнікі.	

7. Лексіка, якая не мае аднаслоўнага адпаведніка ў іншай мове, называецца _____.	
8. Прыдумайце мінімальны кантэкст, у якім слова *восенню* будзе прыслоўем.	
9. Спосаб утварэння слова *перакаці-поле.*	
10. Запішыце любое народнае выслоўе пра *верасень*.	

Адзнака _____

Выкананне тэматычнага комплекснага задання “Восень”

№	Мова	Тэксты	Развіццё маўлення	Знаёмства з лексікаграфічнымі крыніцамі	Персаналіі	Краіназнаўчая інфармацыя

Да задання №9

Прагноз надвор’я можа выглядаць такім чынам: *На Беларусі заўтра чакаецца воблачнае надвор’е. Адносная вільготнасць паветра высокая – ___ працэнтаў. Вецер парывісты, хуткасць ___ метраў за секунду. Тэмпература паветра ___ градусаў вышэй нуля. Дробныя зацяжныя дажджы і туман значна пагоршаць бачнасць на дарогах.*

Ролі для агучвання прагнозу надвор’я

Закаханая дзяўчына;
чалавек, які ненавідзіць сваю працу;
чалавек, які вельмі спяшаецца;
чалавек, у якога баліць жывот;
чалавек, які не выспаўся;
чалавек, які любуецца сабой;
чалавек, які робіць гэта першы раз;
вядучы крымінальнай хронікі;
чалавек, які ніколі не бачыў таго, пра што расказвае.

Да задання №10

Першы кадр (*Апалых лісцяў пах*) можа выглядаць так:
(Камера размешчана ля самай зямлі, усланай кляновым лісцем; на экране кроплі) *Буйным планам барвовыя, аранжавыя, лімонна-жоўтыя лісты. Палова аднаго жоўтага ліста прыціснутая да зямлі, а другая трапеча ад лёгкіх павеваў ветру, час ад часу засланяючы сцяжыну, якая ідзе ўдалечыню і знікае ў тумане.*

4) КВЕТКІ

Чаму пры ўсім багацці пахаў, пры ўсёй прыгажосці ды разнастайнасці Азіі,

самы прыгожы водар у свеце – у простага беларускага бэзу?

Віктар Марціновіч *“Некалькі пытанняў пра наша жыццё”*

1. Перакладзіце назвы кветак з рускай мовы на беларускую:

гвоздика, георгин, гладиолус, гиацинт, лилия, пион, тюльпан, фиалка, хризантема

а) адзначце тыя словы, у якіх пры перакладзе з’явіцца прыстаўны (устаўны) гук;

б) адзначце тыя словы, якія пры перакладзе зменяць граматычны род.

2. Выберыце тыя словы, значэнні якіх прыведзены ў першай калонцы

‘пакрыты кветкамі’	*– кветачны / квяцісты*
‘верхняя частка сцябла з кветкамі’	*– суквецце / саквецце*
‘градка, клумба, дзе растуць кветкі’	*– квецень / кветнік*
‘прадаўшчыца кветак’	*– кветачніца / кветніца*
‘сцябло, на якім размешчана кветка’	*– кветаножка / кветканожка*

3. У першых двух абзацах прапанаванага тэксту сучаснага пісьменніка **Алеся Наварыча** ўстаўце неабходныя знакі прыпынку і раскрыйце дужкі. Якую кветку (занесеную, дарэчы, у Чырвоную кнігу) пазнаў хлопчык Валерка?

Валерка заўважыў нешта чырвонае. Спачатку падумаў што гэта пластыкавы пакет але калі падышоў бліжэй то спыніўся як укапаны.

Сярод пакурчаных лістоў папараці расла дзіўная ніколі (не)бачаная кветка.

“Касачы? Не, яны ваду любяць. Ці не архідэя гэта? – пачаў вызначаць ён расліну. – Гэта дакладна архідэя: чатыры пялёсткі брунатна-чырвонага колеру, пяты ў выглядзе ўздутай губы, падобны на бахілы якія. Бахілы? Гм... Дык гэта ж _____”

4. Перакладзіце назвы кветак з розных славянскіх моў на беларускую мову. Растлумачце матывацыю кожнай з назваў.

Синчец (балгарская), *mečíky* (чэшская), *пролісок* (украінская), *zvonček* (славацкая), *сунцокрет* (сербская), *zlatica* (славенская).

5. Запоўніце табліцу “Кветкавая граматыка”.

	корань	*ліст*	*пялёстак*	*сцябло*
Памяншальная форма				
2, 3, 4 …				
М. скл. адз. лік				
Н. скл. мн. лік				
Р. скл. мн. лік				
Зборны назоўнік				
Прыметнік,				

утвораны ^				

Назавіце спосаб утварэння зборных назоўнікаў.

6. Пры дапамозе кветак здаўна, асабліва на Усходзе, можна было перадаць самыя розныя пачуцці і эмоцыі. З прапанаваных слоў складзіце ланцужкі: колер – кветка – сімвалічнае значэнне.

Фіялка, белы, каханне, цнатлівасць, блакітны, вернасць, лілея, ружа, чырвоны

Па слоўніках кветак самай жорсткай кветкай, якая абазначае нянавісць, з'яўляецца (*васілёк? званочак? рамонак? чабор? гладыёлус? гібіскус? дзьмухавец? сланечнік? нарцыс?*).

Як гэта інфармацыя можа паўплываць на ўспрыманне верша М. Багдановіча "Слуцкія ткачыхі"?

7. Якія кветкі прайграюць у параўнанні з любай дзяўчынай лірычнага героя верша (і песні) **Петруся Броўкі** "Александрына"? Прапануйце тыя кветкі, супастаўленне з якімі магло б задаволіць закаханага юнака.

Цябе з ніякай кветкай не мог я параўнаць:
Сказаць, што _____ *– дык фарба ў ім адна,*
Сказаць, што ты _____ *– сцюдзёная ж яна,*
Сказаць, што ты _____ *– ды ўсіх жа мала іх...*
Такою ты здалася ў сямнаццаць год маіх.

Якія сродкі сінтаксічнай выразнасці выкарыстаны ў паэтычным фрагменце?

8. З якіх мастацкіх твораў узяты прапанаваныя фрагменты? Назавіце кветкі і раскрыйце іх сімвалічнае значэнне ў гэтых творах.

1) Нерухомым позіркам ён углядаўся ў блакітнае неба, нібы прыслухоўваўся да былых сваіх думак: аб нянавісці, аб помсце. І толькі на вуснах засталіся – ні агонь, ні жалеза не змаглі іх сцерці – сляды ўсмешкі, слаўнай, дзіцячай.

Побач ляжала яго торбачка з раструшчаным пад салдацкім ботам пеналам. Ды выпалі з-за пазухі і ляжалі ў пыле запазнелыя восеньскія _____ *(Міхась Лынькоў).*

2) Ён пашукаў чагосьці вачыма і знайшоў гэта: першую кветку _____*. Адламаў яе і прышпіліў да грудзей.*

– Бачыш, – сказаў ён, – мы з табою як на вяселле ідзём. З кветкамі.

– Нашто ты яе зламаў?

– Гэта – мая зямля. І яна застаецца са мною, пакуль ты не адсячэш у апраметнай маёй галавы (Уладзімір Караткевіч).

3) Хлопец з намаганнем расплюшчыў вочы, і першае, што ўбачыў, была ярка-чырвоная кветка ля твару. Лёгкі, мусіць, ранішні ветрык ціхенька варушыў доўгую тоненькую сцябліну гэтае кветкі. Не разумеючы, дзе ён, хлопец ірвануўся, сеў, шырока расплюшчваючы са сну балючыя вочы, азірнуўся і прыемна здзівіўся ад нябачанай, амаль казачнай прыгажосці вакол.

Увесь вялізны прасторны сонечны схіл ззяў шырокім, як возера, ярка-пунсовым разлівам альпійскага _____ *(Васіль Быкаў).*

9. Паспрабуйце закончыць мініяцюру “***Краскі***” дзіцячай пісьменніцы **Леанілы Чарняўскай** *Любяць дзеці краскі не за тое, што маюць якую-небудзь карысць ад іх. Дзеля чаго разводзіць чалавек у сваіх садах бэз, язмін, ружы? Дзеля чаго збіраюць дзяўчаты і дзеці краскі па лугах? Красак жа не ядуць, – дык якая ж з іх карысць?*
10. Прапанаваны тэкст перакладзіце на беларускую мову. *Икебана («ике-жизнь», «хана/бана» – цветы) – японское искусство составления букетов и одновременно философия развития близости человека и природы.* *Структура японской цветочной магии основана на разностороннем треугольнике, точки которого обычно обозначены побегами. В некоторых школах эти точки опоры символизируют небеса, землю и человека.* *Икебана строится по определенным правилам:* *1) все элементы в икебане устанавливаются асимметрично и образуют как бы треугольник;* *2) пропорции трех основных элементов предопределяются размером сосуда – его диаметром и высотой;* *3) при составлении икебаны сосуд должен соответствовать используемому растительному материалу, желательно, чтобы он был однотонным.* *При составлении икебаны из любых растений не должны сочетаться контрастные цвета, как, например, синий и красный.* Паспрабуйце, карыстаючыся законамі ікебаны, скласці сімвалічны букет над назвай “Беларуская літаратура”

5) Для нас – прыроды болей мілай,
Чым беларуская, няма.

Ніл Гілевіч

Як і ўсе непрафесіяналы, я вельмі люблю фатаграфаваць. Людзей, рэчы, славутыя мясціны. А больш за ўсё – беларускую прыроду.

А што такое ўвогуле беларуская прырода? Гэта крыштальныя люстры азёр, блакітныя стужкі рэк, бясконцыя прасторы палёў і лясоў. Гэты скарб нашы продкі змаглі зберагчы і пакінулі нам, мы ж павінны палепшыць яго і перадаць сваім нашчадкам.

Чаму ж **Ніл Гілевіч** лічыць, што для нас няма болей мілай прыроды, чым родная, беларуская? Чаму мы любім гэты край больш за гарачыя тропікі ці велічныя паўночныя краіны?

Прычын гэтай любові вельмі многа, але я вылучыў тры. Перш за ўсё, мы любім родны край таму, што з маленства бачым менавіта гэтыя краявіды, а не

афрыканскія пяскі ці палярныя льды. У дзяцінстве мы, як губка, убіраем у сябе ўсё, што бачылі і чулі. Таму, калі дзеці шмат часу праводзяць на прыродзе, яны вырастуць сапраўднымі патрыётамі. Добры доказ праўдзівасці маіх слоў – жыццё **Канстанціна Міцкевіча (Якуба Коласа)**. Пісьменнік нарадзіўся ў сям'і лесніка і ўсё дзяцінства правёў на ўлонні прыроды. Я лічу, што ў фармаванні яго вялікай асобы навакольныя краявіды адыгралі далёка не апошнюю ролю. Іначай ці змаглі б яго нарадзіцца знакамітыя радкі:

Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!

Па-другое, наша прырода непарыўна звязана з нашай гісторыяй. Колькі разоў у час вайны нашым салдатам і партызанам дапамагалі родныя лясы, балоты. Нават у казцы ёсць момант, калі галоўны герой, звычайны беларус, завёў цмока ў дрыгву́, забіў яго, а сам выратаваўся. Але ж гісторыя ведае шмат вы́падкаў, калі прырода ратавала людзей ад смерці.

Мне ўспамінаецца легенда пра мсціслаўскага князя **Лугвена Альгердавіча**. Князь быў на паляванні, глянуў на яркае сонейка і аслепнуў. Доўга блукаў ён, спрабуючы па гуках зразумець, дзе знаходзіцца. Калі ў князя не засталося сіл ісці, насустрач яму выйшаў манах-пустэльнік, які давёў Лугвена да засыпанай гаючай крыніцы. Сем дзён жыў князь у пустэльніка і расчышчаў крыніцы шлях. Калі крыніца адрадзілася, Лугвен амыў гэтай вадой вочы і зноў стаў бачыць. А недалёка ад крыніцы ён заснаваў Мсціслаўскі Пустынскі Успенскі манастыр.

Такое праносіцца праз стагоддзі, і мы вельмі ўдзячныя роднай прыродзе за выратаваных продкаў. Гэта ўдзячнасць, мабыць, перадаецца нам праз гены.

Трэцяя прычына схавалася ў асабістым жыцці кожнага з нас. Напэўна ж, ёсць такія дрэвы, азёры, рэкі, камяні, якія звязаны з пэўнымі прыемнымі ці нават лёсавызначальнымі момантамі вашага жыцця. Згадзіцеся, што, калі вы бачыце такое дрэва ці камень, дакранаецеся да іх, вы адчуваеце цеплыню тых момантаў. Дык як жа не любіць прыроду, якая зберагае твае ўспаміны!

Дарэчы, у мяне таксама ёсць такое дрэўца, а дакладней – кусточак агрэ́сту, які пасадзіў мой дзядуля. Дзядулі даўно ўжо няма на гэтым свеце, але, калі я збіраю ягады і калюся аб галінкі, я ўспамінаю, як мне было хораша раней.

Такім чынам, любоў да роднай зямлі была закладзена ў нашы сэрцы яшчэ ў дзяцінстве. Яна жыве ў нашых генах, нашых думках і ўспамінах. Мы – частка прыроды, і яна таксама стала часткай нас.

Пакуль што фатаграфіі для мяне – гэта толькі хобі. Але я быў проста на сёмым небе ад шчасця, калі мае здымкі беларускіх краявідаў убачылі і ацанілі расіяне, украінцы і жыхары іншых краін свету. Яны яшчэ не бачылі такой

Беларусі і загарэліся жаданнем наведаць нашу краіну, спазнаць усю яе прыгажосць. Ужо толькі за гэта я магу лічыць сваё жыццё недарэмным.

6) Матэрыялы для складання вуснага выказвання па тэматычным блоку "Маці"

Падрыхтавалі Варановіч Ягор, Навіцкая Каця, Міхальчанка Аліна

Слова "мама"практычна ва ўсіх мовах гучыць аднолькава або вельмі падобна. І рускія, і іспанскія, і кітайскія дзеці называюць сваю маму аднолькава - мама. Англамоўныя дзеці кажуць "mom" – "мам". Дзіўна, праўда? Сакрэт у тым, што самі дзеці выбралі, як ім называць сваіх маці. Адным з першых складоў, якія вымаўляюцца дзіцем, з'яўляецца склад "ма". Менавіта таму практычна ва ўсіх мовах свету гэты склад выкарыстоўваецца ў слове "мама".

Паводле звестак Мінпрацы, у Беларусі налічваецца прыкладна 1,5 млн. сем'яў. Ордэнам Маці ўзнагароджаны 5 тыс. 695 жанчын, якія нарадзілі і выхавалі пяць і больш дзяцей.

У сваім віншаванні да Дня маці Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка адзначыў: сацыяльная палітыка, якая праводзіцца ў нашай краіне, спрыяе таму, каб жанчыны змаглі ажыццявіць сваё прызначэнне – вырасціць і выхаваць здаровых і шчаслівых дзяцей. Абвешчаныя па чарзе Год маці, Год дзіцяці, Год здароўя па змесце ўзаемна дапаўняюць адзін аднаго і даюць магчымасць планамерна рэалізоўваць дзяржаўныя праграмы па ахове мацярынства і дзяцінства, павышэнню статусу і прэстыжу ўзорнай сям'і, паляпшэнню дэмаграфічнай сітуацыі ў рэспубліцы.

У беларускай літаратурнай традыцыі назіраецца выразная тэндэнцыя да правядзення змястоўных паралеляў паміж вобразамі маці і Радзімы. Гэта праяўляецца ў праекцыі ўласнамацярынскіх якасцей – такіх, як ахвярнасць, адданасць, занепакоенасць лёсамі сваіх дзяцей (як, напрыклад, у рамане Ніла Гілевіча "Родныя дзеці"), уменне сілаю сваёй духоўнай творчасці знітава́ць зямлю і тых, хто народжаны ёю, звонкімі струнамі роднай мовы, – на больш шырокі вобраз Радзімы.

Вобраз маці традыцыйны ў беларускай літаратуры. Ён падаецца паэтамі ў непарыўным ланцужку пакаленняў. Гэты вобраз мае вытокі ў міфалогіі і фальклоры, дзе маці – сімвал жыцця, сімвал вечнасці. Апаэтызаваны вобраз коласаўскай маці ў "Новай зямлі", рамантызаваны – у Янкі Купалы, трагічна-ўзнеслы ў паэме "Голас сэрца" Петруся Броўкі. Часта звярталіся да паэтызацыі маці Рыгор Барадулін (асноватворны вобраз яго паэзіі), Аркадзь Куляшоў, Пімен Панчанка, Яўгенія Янішчыц, Максім Танк, Янка Сіпакоў і інш.

Першая і галоўная Маці – Маці Боская. Майстрам паказу Мадонн з'яўляецца італьянскі мастак Рафаэль."Рафаэль заўсёды ўмеў рабіць тое, пра што іншыя толькі маглі марыць" (Гётэ). Самая вядомая Мадонна Рафаэля- "Сексцінская Мадонна", „Мадонна з рыбай", "Мадонна з дзіцём і маленькім Іаанам Хрысціцелем". Лікі Мадонн задуменныя, сур'ёзныя, бездакорныя.

Аддзелам інфармацыйна-бібліяграфічнай работы ЦГБ ім. М. Горкага ў 2004г. быў выдадзены бібліяграфічны спіс «Свет пачынаецца з Маці».

“...Наўчыўся я слоў беларускіх ад маці”, - прызнаваўся пясняр Янка Купала. “Ад маці ўся мая навука”, - сугучны з ім Максім Танк. “Мама – мая небадарная Біблія, якая мяне да жыцця прыручыла”, - сцвярджае Рыгор Барадулін. “Я ў творчасці – маці сваёй паслядоўнік”, - паведаміў нам Пімен Панчанка. “Я музу параўнаў бы з роднай маці”, - высока ацаніў сваю матулю Аркадзь Куляшоў.

Народная мудрасць сцвярджае:*“Бацька фармуе розум, а маці лашчыць цела, душу”*. І гэта сапраўды так. Мужчына імкнецца прадоўжыць сябе ў справах сваіх рук і розуму, у імені і прозвішчы дзіцяці, а жанчына дае жыццё новаму чалавеку, вучыць адрозніваць дабро ад зла. Ад маці мы атрымліваем свае першыя ўрокі.

Так, як пад сэрцам мяне насіла,
У сэрцы сваім я цябе нашу. — **Яраслаў Смалякоў.**

Любоў маці ведае пачатак,
Але ей няма канца. — **Хуліа Матэу.**

Самы вялікі грэх - пакрыўдзіць Маці!
Няма прабачэння чалавеку, які
крыўдзіць маці. — **Заір Азгур.**

Самая лепшая маці тая,
Якая можа замяніць дзецям бацьку,
Калі яго не стане. — **Іаган Гётэ.**

Казка пяшчоты мацярынскай
Застанецца на ўсё жыццё. — **Фелікс Дзяржынскі.**

Матуліны рукі нас песцяць, галубяць,
Так шчыра. як маці, ніхто нас не любіць.
Матуліны рукі - адзіныя ў свеце.
Шануйце, любіце заўсёды іх, дзеці. (**Вера Вярба**)

Толькі любоў маці сапраўды мацнейшая за смерць. (**Іван Шамякін**)

Калі нам бывае асабліва цяжка ў жыцці, мы заўсёды ўспамінаем маці. (**Леанід Дайнека**)

Рэспубліканскі Дзень Маці зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 30 ліпеня 1996 года. Свята адзначаецца 14 кастрычніка, што супадае з праваслаўным святам Пакрова Боскай Маці. Паводле тлумачэнняў праваслаўнай царквы, пакровы – пакрывала Божай маці, якая абараніла людзей ад бяды.

Ордэн Маці быў заснаваны ўказам Прэзідэнта Беларусі ў 1995 годзе. Усяго з 1996 года гэтым высокім знакам мацярынскай доблесці

ўзнагароджаны 7 тыс. 430 жанчын. Ордэнам Маці ўзнагароджваюцца жанчыны, якія нарадзілі і выхавалі пяць і больш дзяцей. Ордэн Маці - адзіная беларуская ўзнагарода, прызначаная для ўзнагароджання жанчын за заслугі ў нараджэнні і выхаванні дзяцей. Першы Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб узнагароджанні шматдзетных маці Ордэнам маці выйшаў 14 кастрычніка 1996 г.

Сёння Столінскі раён Брэсцкай вобласці па колькасці шматдзетных сем'яў – абсалютны чэмпіён краіны. Тут іх пражывае каля 2 тысяч.

У ЗША і Аўстраліі існуе традыцыя насіць у Дзень маці на вопратцы кветку гваздзіка. Прычым колер мае значэнне. Так каляровы гваздзік кажа пра тое, што маці чалавека жывая, а белыя кветкі прышпільваюць да адзення ў памяць аб памерлых маці.

Манумент у гонар савецкай маці-патрыёткі ў Жодзіна адкрыты ў 1975 г. (скульптары **Андрэй Заспіцкі**, **Іван Міско**, **Мікалай Рыжанкоў**, архітэктар **Алег Трафімчук**). У помніку ў абагульненай мастацкай форме ўвасоблены драматычны лёс маці-патрыёткі. Правобразам скульптуры маці стала жыхарка горада **Анастасія Фамінічна Купрыянава** - маці пяцярых сыноў, якія загінулі за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы.
У мемарыяле «Рэспубліканскі помнік воінам-інтэрнацыяналістам « Востраў Мужнасці і Смутку » скульптурная група жанчын, застылых ад гора, сімвалізуе сабой усіх маці Беларусі, якія страцілі сваіх сыноў. Фігуры жанчын акружаюць Храм Памяці. У руках маці свяцільні – сімвалы хатняга агню, які свеціцца ўночы.

Прыказкі пра маці

Без маткі і сонца не грэе.
Без роднай мамачкі заклююць і галачкі.

Матчыны рукі заўсёды мяккія.
Беражы маці, не век яна маладою будзе.
Дзіця за руку бярэш — маці за сэрца.
Пакуль маці любіць, лёс дзіця галубіць.
Хоць будзеш ужо старэнькі, а для маці — ўсё маленькі.
Маці апошні акраец аддасць дзіцяці.
Маці — сэрца сям'і.
Сэрца маці лягчэйшае за пух і цвярдзейшае за камень.
Няма прабачэння раўнадушшу да маці.
Маці — самы надзейны сябар.
Самы вялікі грэх — пакрыўдзіць маці.
Самая бескарыслівая любоў — любоў да маці.

Прытча пра маці

Тры жанчыны бралі ваду ў калодзежы.
Да іх падышлі сыны. Адзін пацалаваў маці і пабег, весела напяваючы, далей.
Другі сын запытаў: "Ты не стамілася?" і пабег даганяць таварышаў.
Трэці моўчкі ўзяў вёдры ў маці і панёс іх дадому.
Усё гэта міжволі бачыў самы мудры чалавек у сяле.
– Скажы, мудрэц, – запыталі маці, калі параўнялася з ім, – чый сын самы лепшы?
– О, жанчыны, тут быў толькі адзін сын, — адказаў стары.